Источник: "Навука" - 2015-09-21

# І ЗАКРАСУЕ СКРОЗЬ ШЫПШЫНА...

***да 110-годдзя з дня нараджэння П.Ф.Глебкі***




**23 верасня 2015 года а 15-й гадзіне ў чытальнай зале рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я.Коласа НАН Беларусі адбудзецца імпрэза «І закрасуе скрозь Шыпшына...», прысвечаная 110-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага паэта, перакладчыка, вучонага, грамадскага дзеяча, акадэміка Пятра Фёдаравіча Глебкі (1905-1969).**

Сумеснае мерапрыемства падрыхтавана супрацоўнікамі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. У межах імпрэзы адкрыецца выстава «І краскі, і словы завіў у вянок… (па матэрыялах калекцыі П.Ф.Глебкі)» і будзе прэзентаваны каталог «Бібліятэка акадэміка П.Ф.Глебкі (1905-1969)», падрыхтаваны ў выдавецкім доме «Беларуская навука».

Пятро Фёдаравіч Глебка нарадзіўся 6 ліпеня 1905 года ў вёсцы Вялікая Уса Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і селяніна. Пачаў літаратурную дзейнасць яшчэ ў 1920-я гады. У сваёй творчасці ён шырока адлюстраваў асноўныя этапы жыцця савецкага грамадства: рэвалюцыю, веліч стваральнай працы народа, яго гераічнае змаганне супраць фашызму, барацьбу за аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі.

Творчы шлях Пятра Фёдаравіча ахоплівае больш за чатыры дзесяцігоддзі. У друку дэбютаваў вершамі ў 1925 годзе ў газетах «Беларуская вёска», «Савецкая Беларусь», часопісах «Работніца і сялянка», «Беларускі піянер». Аўтар кніжак паэзіі «Шыпшына» (1927), «Урачыстыя дні» (1930), «Арка над акіянам» (1932) і інш.

Займаючы адказныя пасады ў Акадэміі навук, П.Ф.Глебка актыўна ўздзейнічаў на навуковы працэс. Ён аўтар многіх прац у галіне беларускай лексікаграфіі, мастацтвазнаўства і фалькларыстыкі. Ініцыятар выдання ў АН БССР шматтомнага збору беларускага фальклору.

П.Ф.Глебка на працягу ўсяго жыцця збіраў уласную бібліятэку. Яшчэ пры жыцці, у 1967 годзе, падчас пераезду Фундаментальнай бібліятэкі Акадэміі навук БССР у новы будынак, Пётр Фёдаравіч упершыню паведаміў аб намеры перадаць свой кнігазбор і рукапісны архіў на захаванне ў акадэмічную бібліятэку. Пасля смерці акадэміка яго жонка Ніна Іларыёнаўна перадала частку кнігазбору і рукапіснага архіва ў фонд аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў. Асноўная частка кніжнай калекцыі П.Ф.Глебкі перайшла ў бібліятэку пасля смерці жонкі паэта, у лістападзе 1986 года. Цяпер бібліятэка акадэміка разам з абсталяваннем яго рабочага кабінета знаходзіцца ў асобным пакоі ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў. Кнігазбор налічвае 3.867 экзэмпляраў выданняў на беларускай, рускай, украінскай і іншых мовах, надрукаваных у 1804-1960 гадах.

На выставе «І краскі, і словы завіў у вянок…» будуць прадстаўлены выданні з асабістай калекцыі П.Ф.Глебкі і фондаў бібліятэкі, а таксама дакументы з яго архіва. У асобным раздзеле дэманструецца друкаваная літаратурная спадчына пісьменніка: зборы твораў, кнігі вершаў (у тым ліку першыя зборнікі вершаў «Шыпшына», «Урачыстыя дні» і інш.), паэмы, літаратуразнаўчыя працы, а таксама шмат выданняў, у рэдагаванні якіх браў удзел П.Ф.Глебка. Значную частку кнігазбору складаюць кнігі па пытаннях літаратуразнаўства і мовазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Сярод іх – працы вядомых вучоных Е.Р.Раманава, П.В.Шэйна, Я.Ф.Карскага, С.П.Сахарава і іншых. Асаблівай увагі заслугоўваюць друкаваныя дакументы, якія адлюстроўваюць з'явы і падзеі грамадска-палітычнага жыцця Беларусі і з'яўляюцца выразнымі гістарычнымі помнікамі сваёй эпохі. У іх шэрагу – «Статут Великого Княжества Литовского» (1811), «Дневник Люблинского сейма 1569 года» (1869) і інш.

Шырока прадстаўлены творы беларускіх пісьменнікаў. Гэта рэдкія выданні канца XIX – пачатку XX ст., прыжыццёвыя і першыя выданні. Многія з таленавітых беларускіх пісьменнікаў сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій, а іх кнігі – бібліяграфічнай рэдкасцю. Адметнай рысай бібліятэкі П.Ф.Глебкі з'яўляецца наяўнасць вялікай колькасці кніг з дарчымі надпісамі, многія з іх прадстаўлены на выставе.

У экспазіцыі будуць дэманстравацца і матэрыялы з рукапіснага архіва П.Ф.Глебкі: дакументы да біяграфіі пісьменніка, пасведчанні, даведкі, рэдкія дакументы часоў Вялікай Айчыннай вайны, цікавыя фотаздымкі, пасведчанні да ўзнагарод, ордэна і медалі.

На стэлажах можна будзе ўбачыць даведачную літаратуру: энцыклапедыі, слоўнікі і даведнікі па разнастайных галінах ведаў. А таксама «Русско-белорусский словарь» (1953), які рэдагаваў П.Ф.Глебка.

Завершаць экспазіцыю публікацыі літаратурных крытыкаў, успаміны сяброў і знаёмых пісьменніка. Самыя раннія з іх – артыкулы 30-х гадоў мінулага стагоддзя.

Выстава «І краскі, і словы завіў у вянок…» будзе працаваць на працягу месяца.

**Вольга ГУБАНАВА,**
**Алена ДЗЕНІСЕНКА,**
**Валерыя НАВУМЕНКА,**
**навуковыя супрацоўнікі ЦНБ НАН Беларусі**